23.06.2024 / 12:07 11

У чым памылка Прыгожына і ці можа нехта захацець паўтарыць мяцеж?

«Нас не змогуць знішчыць — у нас ёсць мэты, мы гатовыя ўсе памерці», — год таму, у ноч з 23 на 24 чэрвеня 2023 года, гэтая фраза з'явілася ў

самай вядомай прыватнай арміі ў свеце — Яўгена Прыгожына. За некалькі гадзін да гэтага ён пачаў узброены мяцеж — абвясціў, што 25 тысяч байцоў ідуць у Маскву «караць» тагачаснага міністра абароны Сяргея Шайгу і начальніка Генштаба Валерыя Герасімава. Да Масквы «вагнераўцы» так і не дайшлі. На подступах да сталіцы Прыгожын аддаў загад «разварочвацца», але ПВК без бою ўзяла горад-мільёнік Растоў-на-Доне, збіла шэсць

самалёт Іл-22. Роўна праз два месяцы ў авіякатастрофе загінуў і сам Прыгожын.

Яўген Прыгожын паехаў Растоў-на-Дону пасля

Getty Images

Пра бунт Прыгожына «Холад» пагаварыў з суаўтарам кнігі «Наш бізнэс — смерць» пра ПВК «Вагнер» Іллём Барабанавым.

— На знакамітым відэа з Растова Прыгожын кажа Еўкураву і Аляксееву: «Мы хочам атрымаць начальніка Герасімава і Шайгу». А на што, як вам здаецца, ён рэальна разлічваў з гэтым мяцяжом? Якія ў яго, на вашу думку, былі планы на вечар 24 чэрвеня?

— Трэба разумець, што Яўген Віктаравіч — ён усё ж такі чалавек з 1990-х. Ён бізнэсмен з паняційнымі ўяўленнямі аб жыцці. На працягу некалькіх месяцаў ён вёў публічны гандаль з Міністэрствам абароны. І відавочна, што ён спадзяваўся

выгандляваць сабе нейкія ўмовы выйсця з гэтай сітуацыі.

У студзені 2023-га года яго пазбавілі магчымасці вербаваць зэкаў. Гэтую магчымасць забрала сабе Міністэрства абароны. У баях за Бахмут, мы ведаем, Прыгожын «стачыў» 20 тысяч гэтых зэкаў, так што далей калі б «Вагнер» працягнуў прымаць удзел у вайне з ранейшай інтэнсіўнасцю, то ў вельмі хуткім часе ад яго б нічога не засталося.

Прыгожыну трэба было неяк выйсці з гэтай вайны і захаваць свой ваенны актыў. Аб гэтым ён спрабаваў дамовіцца.

Але, як мы памятаем, дамовіцца яму аб гэтым не ўдалося. Уладзімір Уладзіміравіч

дадзеным выпадку Пуцін таксама стаў на бок бюракратыі, сказаўшы, што хто б дзе ні бегаў і ў каго б якія заслугі перад Расійскай Федэрацыяй не меліся, усё роўна ў выніку ўсё павінна быць уніфікавана — усе павінны падпісаць кантракты з Мінабароны.

Думаю, Прыгожын расцаніў тое, што адбываецца, літаральна як спробу рэйдарскага захопу свайго асноўнага актыву. А ягоны мяцеж — гэта адчайная спроба выгандляваць сабе хоць нейкія ўмовы далейшага існавання.

— У выніку прайграўшы бітву за існаванне нават фізічна.

— Гэта тое, што мяне больш за ўсё

як Пуцін ахарактарызаваў яго дзеянні як здраду, як ён мог паверыць любым гарантыям, якія яму даў, усё роўна, Дзюмін ці Лукашэнка? Як ён заставаўся пасля гэтага ў Расіі? Ён жа цудоўна ведаў, што адбываецца з тымі людзьмі, якіх Пуцін называе здраднікамі!

Калі Пуцін назваў цябе здраднікам, то твой жыццёвы фінал зразумелы. І працягвацца гэты фінал будзе вельмі нядоўга. Выглядае, што Прыгожын у апошнія месяцы проста ўжо не вельмі адэкватна ацэньваў сябе, сваю вагу, што адбывалася на вайне і вакол яе.

> **Я думаю, ён пераацаніў сваю значнасць для сістэмы. Я думаю, што ён быў**

на тое, што «Вагнер» выходзіць з гульні на ўкраінскім фронце, яго ўсё роўна захаваюць, паколькі Крэмль шануе тую працу, якую «Вагнер» вёў у Сірыі і на афрыканскім кантыненце.

Я думаю, што Прыгожын лічыў, што паколькі для Крамля Афрыка — гэта важны напрамак, то яму захаваюць жыццё і дазволяць працягнуць працу там. Гэта было памылковае разважанне.

Замест «Вагнера» цяпер ваюе Афрыканскі корпус, створаны Цімчанкам і Еўкуравым. У Малі, Буркіна-Фасо бегаюць і спраўляюцца з усімі задачамі, якія раней

— Вас здзівіла, як менавіта Прыгожын быў ліквідаваны?

— Я думаю гэта наўпрост звязана са збітымі верталётамі і самалётамі падчас мяцяжу. У Пуціна ёсць шмат опцый збавення ад апанентаў, ад «Навічка» да «Палонія-210», але тое, што ў выніку зрабілі з Яўгенам Віктаравічам вылучаецца на любым фоне.

Я думаю, што тое, што адбылося ў небе над Цвярской вобласцю, — гэта прамая адсылка да таго, што менавіта яму ў выніку не даравалі, гэта значыць менавіта гэтыя збітыя барты, менавіта гэтых лётчыкаў. У літаральным сэнсе — прыляцела ў адказ.

На кага разлічана гэтая адсылка?

— На ўсіх. На мой погляд, гэта было проста паказальнае пакаранне. Каб ні ў кога больш і думкі ў галаве не было аб тым, што падобны мяцеж магчымы.

Мы бачым, як дэманстратыўна гэтая справа не расследуецца. Як дэманстратыўна не дапусцілі да расследавання вытворцу гэтых самалётаў — бразільскую кампанію.

І мы бачым, што, увогуле, Уладзімір Уладзіміравіч нават не хавае, хто насамрэч аддаў загад. Калі ён там потым пачаў расказваць, што Прыгожын і яго паплечнікі проста напіліся, нанюхаліся і пачалі кідацца гранатамі, — гэта паведамленне ўсім у сваім асяроддзі пра тое, якія будуць наступствы, калі яны нават думку пра «здраду» дапусцяць

— Вам, дарэчы, здаецца, што мяцеж Прыгожына аддаліў наступную спробу пераваротy ці наблізіў? І нехта можа захацець паўтарыць?

— Думаю, і тое, і іншае, як ні парадаксальна. З аднаго боку, нехта мог паглядзець на ўсё, што адбылося, і спалохацца. З іншага, відавочна, што калі ў кагосьці ў агляднай будучыні ўзнікнуць падобнага роду думкі, то гэты чалавек зараз сапраўды ведае, што трэба даводзіць справу да канца.

> **Дамовіцца з Уладзімірам Уладзіміравічам ні пра што не атрымаецца. Не трэба хадзіць на Міністэрства**

абароны — трэба ісці адразу на Крэмль.

Чытайце таксама:

У Пецярбургу затрыманыя былыя менеджары медыяімперыі Яўгена Прыгожына

«ПВК Вагнер» завербавала на вайну ва Украіне ў калоніях 48 тысяч зняволеных. З іх пад Бахмутам загінулі не менш за 17 тысяч

У Пецярбургу паставілі помнік Прыгожыну ФОТАФАКТ

Nashaniva.com

Хочаш падзяліцца важнай інфармацыяй ананімна і канфідэнцыйна?

Пішыце рэдактару «Нашай Нівы» ў ТГ

ПАДЗЯЛІЦЦА

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

Польшча рыхтуецца да хвалі расійскіх кібератак

Дарадцы Трампа прадставілі план спынення вайны Расіі супраць Украіны 10

Брытанская прынцэса Ганна страціла памяць пасля траўмы 1

ПАДБОРКІ

Яўген Прыгожын

КАМЕНТАРЫ

Ага /адказаць/
24.06.2024

2 0

↳**Anatol Starkou**, путинские олигархи как пришли с

Агіда/адказаць/
24.06.2024

3 0

'Евгеній Вікторовіч", 'Владімір Владіміровіч'... Агідна ад гэтых 'добрых рускіх' пісьменнікаў-казачнікаў, якія нават нездольныя перастаць называць гэтых вурдалакаў па 'імені-отчеству'.

Карма/адказаць/
24.06.2024

0 0

Роўна праз два месяцы ў авіякатастрофе загінуў і сам Прыгожын.

Супадзенне? - Так, супадзенне!

ПАКАЗАЦЬ УСЕ КАМЕНТАРЫ

КАМЕНТАВАЦЬ

ІМЯ

Націсканьне кнопкі «Дадаць каментар» азначае згоду з рэкамендацыямі па абмеркаванні.

Спам-фільтр: падлічыце, колькі будзе...



не бачу сімвалы

ДАДАЦЬ КАМЕНТАР

Дарадцы Трампа прадставілі план спынення вайны Расіі супраць Украіны 10

Турма будучыні. Навуковец прапанаваў хуткі спосаб перавыхавання злачынцаў — даць адчуць пакуты іх ахвяр

Школьніца з Мінска мае 400 балаў для паступлення

«Вельмі складана зразумець, што ёсць дзве праўды». Літоўскі гісторык пра «Пагоню» і спадчыну ВКЛ

Натарыусаў будуць пазбаўляць ліцэнзій за падпіскі і рэпосты. Ім забаранілі каментаваць працу дзяржорганаў у

«Выехаў на паласу сустрэчнага руху, проста ў лоб». Што кажуць відавочцы ДТЗ пад Маладзечнам

Клетка ў жаночай калоніі. Што гэта такое і якія нормы парушае? 1

Забаўны факт: на выхад у плэй-оф Еўра-2024 з трэціх

Брытанская прынцэса Ганна страціла памяць пасля траўмы

былой Аўстра-Венгрыі 2

Былы польскі суддзя Шміт стаў карэспандэнтам БелТА 3

сцягам. Але адказнасцю пагражаюць не ёй, а таму, хто гэта заўважыў 14

шыюць фінансаванне тэрарызму — да дваццаці гадоў калоніі

Зеленаградскі Чыкаціла пайшоў на вайну 3

Махляры прапануюць квіткі са зніжкай на маршруткі «Атлас»

У Мінску кур'ер на электрасамакаце ўцякаў ад ДАІ — ВІДЭА

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Блогер Павук паехаў у турму. Але ёсць нюанс

У Іспаніі вызвалілі з рабства беларусак 2

Пентагон пра ўдары па Крыме: Калі РФ занепакоеная сваімі стратамі, няхай спыняе вайну 1

У Маладзечанскім раёне легкавік сутыкнуўся з маршруткай, яна перакулілася. Усе жывыя

Сядзіць у камеры насупраць Бабарыкі. У якіх умовах трымаюць журналіста «Радыё Свабода» Ігара Лосіка 1

Ксяндза Анджэя Юхневіча прызналі палітвязнем

Польшча рыхтуецца да хвалі расійскіх кібератак

Сярэдні заробак за май вырас на 37 рублёў

Мінчук разбіў шкло на прыпынку. Цяпер ён павінен выплаціць велізарную суму 1

Арына Сабалюка спрагназавала

футболе

СТУЖКА НАВІН

КАЛЯНДАР

2023 2024 2025

Май Чэрвень Ліпень

ПН	АЎ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НД
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23



24	25	26	27	28	29	30

PDF ВЕРСІЯ

Навіны
Улада
Выбары-2020
Эканоміка
Грамадства
Здарэнні

Культура
Гісторыя
Афіша
Музыка
Мова
Кіно

Спорт
Аўто
Меркаванні
Ад рэдакцыі
Архіў
Блог "Новая Беларусь"
Вайна

Здарэнні

Здароўе

Культура
Тэатр

Навука і тэхналогіі

Спорт

Аўто

Каханне і сэкс



КАНТАКТЫ

PRAS by Дызайн сайта — арт-студыя PRAS

© Усе правы абароненыя. Выкарыстанне платных матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных рускамоўных версій матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных беларускамоўных версій матэрыялаў дазваляецца пры ўмове наяўнасці актыўнай гіперспасылкі на Nashaniva.com у першым абзацы.

